формирование социальнопрофессиональной компетентности будущего специалиста сферы культуры.

## ФАРМІРАВАННЕ Ў СТУДЭНТАЎ МІЖКУЛЬТУРНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ У ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ ФІЛАСОФСКІХ ДЫСЦЫПЛІН

***Бабко А.І.**, дацэнт кафедры*
*філасофіі і метадалогіі*
*гуманітарных навук, кандыдат*
*філасофскіх навук, дацэнт*

У сучасных умовах удзельная вага міжкультурных стасункаў ва ўсіх сегментах духоўнага жыцця чалавека і грамадстваня ўхільна і незваротна павялічваецца. Таму фарміраванне ў навучэнцаў кампетэнцый, якія забяспечваюць паспяховую рэалізацыю міжкультурнага складніка найперш у іх прафесійнай дзейнасці (аднак не толькі ў ёй), робіцца ўсё больш актуальнай задачай сістэмы адукацыі на ўсіх яе ўзроўнях, у тым ліку і на вышэйшай яе ступені. Міжкультурная кампетэнтнасць выступае як сукупнасць ідэалаў, прынцыпаў, перакананняў, ведаў, інтэнцый, метадаў, навыкаў і ўменняў, якія дазваляюць эфектыўна дзейнічаць у самых розных сітуацыях, у якіх удзельнічаюць прадстаўнікі розных культур і на якія істотным чынам уплываюць разнастайныя феномены, артэфакты і сэнсы, што да гэтых культур належаць. Такім чынам, яна мае дастаткова складаную структуру, у якой у самым агульным плане можна вылучыць два грунтоўныя кампаненты: тэарэтычна-інтэрпрэтацыйны і маральна-практычны.

Надзвычай важным падаецца таксама той момант, што кампетэнцыі, у якіх яна выяўляецца, нельга адназначна лакалізаваць у адпаведнай (кампетэнтнаснай) сферы. Яны належаць і да прафесійнага, і да сацыяльна-асобаснага, і да акадэмічнага яе сегментаў. Гэта абумоўлена наяўным у іх магутным дыялагічным складнікам, які мае грунтоўнае значэнне ва ўсіх галінах і на ўсіх узроўнях чалавечай дзейнасці. Веды, навыкі, мадэлі паводзін, прынцыпы і метады, якія дазвадяюць творча і плённа вучыцца, працаваць, адпачываць у інтэрнацыянальным, шматкультурным асяроддзі надзвычай запатрабаваныя ў сучасных умовах, і сістэма адукацыі павінна ўлічваць гэтую запатрабаванасць і адэкватна рэагаваць на яе.

У гэтым плане неабходна адзначыць адпаведны патэнцыял філасофскіх дысцыплін, якія ва ўсіх выпадках і самым дзейсным чынам спрыяюць фарміраванню міжкультурнай кампетэнтнасці студэнтаў. У філасофіі факусуюцца найгрунтоўнейшыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характарыстыкі культуры, і таму зразумець пэўныя яе нацыянальныя ўвасабленні (ці праявы іншага кшталту) немагчыма без сур'ёзнага вывучэння іх філасофскіх падстаў. Разам з тым, акрамя глыбокіх ведаў адносна духоўных асноў розных культур, вывучаючы філасофскія дысцыпліны, студэнты набываюць таксама трывалыя інтэрпрэтацыйныя ўменні і навыкі – і ў агульным плане, і з міжкультурнага пункту гледжання (істотнае значэнне мае ў гэтым плане філасофская герменеўтыка, якая нацэльвае на разуменне і вытлумачэнне іншага ў яго адметнасці дзеля пашырэння ўласнага духоўнага далягляду, на перанясенне "пэўнай сэнсавай сувязі з іншага "свету" ва ўласны" [1, с.1062] (пераклад мой – А.Б)). Плюральнасць і разнастайнасць філасофскіх дыскурсаў (яскравае сведчанне таго, што свет можа быць убачаны, зразуметы, вытлумачаны і пражыты па-рознаму) спрыяе таксама фарміраванню ў іх талерантнага стаўлення да іншага і "іншасці" ўвогуле, якое належыць да найважнейшых маральных аспектаў міжкультурных кампетэнцый.

Відавочна, аднак, што без мэтанакіраванай працы, засяроджанай на фарміраванні ў студэнтаў высокадухоўных і творчых мадэляў паводзін у кантэксце міжкультурных дачыненняў, адпаведныя – сапраўды грунтоўныя – патэнцыі філасофіі не будуць выкарыстаны ў поўнай ступені, з тымі вынікамі, якія яны здольныя прынесці. Дзеля таго каб быць паспяховай, згаданая праца павінна абапірацца на пэўнае канцэптуальнае бачанне выкладання філасофскіх дысцыплін, неабыякавага і эфектыўнага з дадзенага пункту гледжання.

Да самых перспектыўных прэтэндэнтак на ролю канцэптуальнай асновы такога кшталту належыць міжкультурная філасофія – кірунак, што паўстаў пры канцы XX стагоддзя найперш у нямецкамоўнай культурнай і філасофскай прасторы. Прыхільнікі гэтай плыні засяродзіліся на ўсебаковым спрыянні разгортванню міжкультурнага дыялогу (найпершу абсягу самога філасофскага пошуку). Найважнейшай передумовай згаданага разгортвання яны лічаць адмову ад еўрацэнтрызму ў філасофскіх даследаваннях, г. зн. адмову ад надання філасофска-пазнавальным стандартам і стратэгічным арыенцірам, уласцівым заходняй філасофскай думцы, статусу найвышэйшых, найбольш значных і дзейсных [3, с.126].

Надзвычай важна, што прадстаўнікі дадзенага філасофскага кірунку ні ў якім разе не разглядаюць памянёную адмову як уцёкі ад сваёй тоеснасці, ад прыналежнасці да заходняга культурнага і філасофскага абшару. Зусім наадварот: яны падкрэсліваюць, што без усебаковага і глыбокага высвятлення сутнасных вызначэнняў уласнай філасофскай пазіцыі міжкультурны філасофскі праект здзейсніць немагчыма [3, с.126]. Важнасць гэтай канстатацыі ў кантэксце фарміравання ў студэнтаў міжкультурных кампетэнцый абумоўлена тым, што глыбокая ўкаранёнасць у сваёй роднай культуры, прасякнутасць яе існасцю, валоданне яе мовай, яе сімваламі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спасціжэнне яе гісторыі выступаюць як грунтоўныя перадумовы згаданых кампетэнцый. Сапраўды, толькі праз іх прызму і на іх аснове студэнт (і кожны індывід увогуле) можа наблізіцца да разумення іншай культуры, яе характару, яе спецыфікі і выпрацаваць адэкватнае стаўленне да яе, а таксама плённа дзейнічаць у сітуацыях, у якіх ён сутыкнецца з яе носьбітамі або праявамі (гэта надзвычай яскрава выяўляецца ў дачыненні да вывучэння мовы, на якой прамаўляе іншая культура: засвоіць яе немагчыма без глыбокага валодання роднай мовай).

Неабходна адзначыць, што ў сучасных умовах у міжкультурнай філасофіі з'явілася канкурэнтка ў кантэксце прэтэнзій на ролю надзейнай філасофска-тэарэтычнай асновы плённага дыялогу культурных і адпаведных філасофскіх традыцый (а таму і фарміравання ў студэнтаў міжкультурнай кампетэнтнасці ў працэсе выкладання філасофскіх дысцыплін). Гаворка ідзе пра кірунак, які грунтуецца на прынцыпе транскультурнасці. Згодна з дадзеным прынцыпам кожная з сучасных культур (а ў пэўным сэнсе і пэўнай ступені не толькі сучасных) уяўляе сабой гібрыднае ўтварэнне, г. зн. уключаеў сябе ў якасці істотных і неад'емных элементы, аспекты, уласцівасці, якія паходзяць з іншых культурных абсягаў, так што гаворка пра яе спецыфічнае этнічнае ядро губляе ўсякі сэнс [4].

Дадзеная пазіцыя, безумоўна, спрыяе стварэнню прасякнутай прынцыпам талерантнасці атмасферы ў міжкультурных дачыненнях, а ў галіне адукацыі – засваенню студэнтамі згаданага прынцыпу (як падкрэслівалася вышэй, надзвычай важнага ў кантэксце фарміравання ў іх міжкультурных кампетэнцый). Разам з тым, аднак, характэрная для яе ідэя размытай тоеснасці вядзе таксама да размывання ідэі іншасці, прытупляе адчуванне іншага, змяншае пільнасць і ўвагу да яго. Таму ў канчатковым выніку яна можа негатыўна паўплываць на дыялагічныя інтэнцыі і практыкі яе носьбітаў, не дазваляючы ім у поўнай ступені выкарыстаць дыялагічныя зносіны для свайго самаразвіцця. Зусім не выпадковымі ў дадзенай сувязі падаюцца разыходжанні паміж гэтай канцэпцыяй і філасофскай герменеўтыкай, істотнае значэнне якой у кантэксце фарміравання міжкультурных кампетэнцый у студэнтаў было адзначана вышэй.

Што да міжкультурнай філасофіі, дык яна арганічна стасуецца з герменеўтычным падыходам і яе прадстаўнікі недвухсэнсоўна дэкларуюць сваю прыхільнасць да адпаведных стратэгій філасофскага пошуку [2, с.72]. Гэта важкі аргумент на яе карысць у кантэксце вызначэння філасофскіх падстаў фарміравання міжкультурных кампетэнцый у студэнтаў: філасофскую герменеўтыку з яе засяроджанасцю на працэсах разумення, інтэрпрэтацыі і ўжывання іх вынікаў на практыцы ігнараваць у працэсе згаданага фарміравання нельга.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, у сучасных умовах, ва ўмовах інтэрнацыяналізацыі ўсіх сфер і бакоў чалавечай дзейнасці, сапраўдны прафесіяналізм без развітых міжкультурных кампетэнцый недасягальны. Сістэма адукацыі (і кожная з яе падсістэм) павінна ўлічваць дадзеную акалічнасць і выкарыстоўваць усе наяўныя ў ёй магчымасці і сродкі дзеля іх фарміравання ў навучэнцаў. Надзвычай багатымі на такія магчымасці з'яўляюцца філасофскія дысцыпліны. Каб з максімальнай эфектыўнасцю і паўнатой задзейнічаць іх, неабходна мэтанакіравана і сістэматычна працаваць у адпаведным напрамку, абапіраючыся на трывалую, надзейную канцэптуальную аснову. Ролю такой асновы можа выканаць міжкультурная філасофія – кірунак, прадстаўнікі якога імкнуцца паспрыяць разгортванню дыялагічных стасункаў паміж рознымі культурнымі і філасофскімі традыцыямі. Істотны патэнцыял у дадзеным кантэксце выяўляе таксама філасофская герменеўтыка – не задзейнічаць яго ў працэсе фарміравання ў студэнтаў міжкультурных кампетэнцый было б грунтоўнай памылкай.

1.Gadamer, H.-G. Hermeneutik / H.-G.Gadamer // Historisches Wörterbuch der Philosophie:in 13 Bänden / hrsg. von J.Ritter, K.Gründer, G.Gabriel. – Basel: Schwabe Verlag, 1971-2007. – Bd.3. – S.1062 – 1073.

2.Gmainer-Pranzl, F. Verständigung – Anerkennung – Identität. Zur kommunikationstheoretischen Rekonstruktion von «Kultur» bei Jürgen Habermas / F. Gmainer-Pranzl // Polylog, 2013, №29. – S. 67-84.

3.Schmied-Kowarzik, W. Thesen zum interkulturellen Selbstverständnis der Philosophie / W.Schmied-Kowarzik//Polylog.– 2016, №35. – S. 123-143.

4.Welsch, W. Transculturality – the Puzzling Form of Cultures Today / W.Welsch // Spaces of Culture: City, Nation, World. – Ed. byM.Featherstone and S.Lash. – London: Sage, 1999. – P. 194-213.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРИЕМЫ ФОРМИРОВАНИЯ ПРОФЕССИОНАЛЬНЫХ КОМПЕТЕНЦИЙ СТУДЕНТОВ В ВУЗЕ КУЛЬТУРЫ И ИСКУССТВ

***Грачева О.О.,*** *доцент кафедры*
*психологии и педагогики,*
*кандидат искусствоведения,*
*доцент*

В процессе преподавания цикла психолого-педагогических дисциплин в вузе культуры и искусств практико-ориентированный подход является основой мотивации студентов к учению. Дидактический принцип связи теории с практикой находит свое воплощение уже на самых первых лекциях указанного цикла.